Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond 9 Vopis 1 Sprava 364

З захопам у БеларусІ камунІстамІ І рускІмІ акупантамІ І каланІзатарамІ улады,наша КраІна фактычна стала таталІтарнай бальшэвІцка-камунІстычнай рускай калонІяй у галаве з марыянетачным прэзыдэнтам-дыктатарам - Лукашэнкам А.Р.Аб гэтым сведчаць агульнавядомыя факты.

І.Улада была захоплена абманным папулІстскІм шляхам - вядомымІ абяцанкамІ-цацанкамІ "прастому народу"падчас прэзыдэнтскІх выбарау.НІ адна Із нІх да гэтага часу не выканана,хаця Ідзе ужо пяты год прэзыдэнтства ЛукашэнкІ А.Р.

2.Лукашэнка сваю выбарчую кампанІю у прэзыдэнты праводзІу па КанстытуцыІ 1994года,пад беларускІмІ гІстарычнымІ дзяржаунымІ сІмваламІ - гербам "ПАГОНЯ" І БЕЛА-ЧЫРВОНА-БЕЛЫМ сцягам.ВернасцІ гэтай КанстытуцыІ ён прысягау,будучы абраны прэзыдэнтам,утоІваючы ад "прастога народа",што стаушы прэзыдэнтам,ён Іх зняважыць,парве на шматкІ І утопчыць у гразь.

3.Лукашэнка А.Р. пры падтрымцы рускІх ІмперыялІстаў,фашыстаў,шавІнІстау,нацыстаў,акупантау І каланІзатарау БеларусІ,для якІх утрата сваІх былых калонІй,стала,што утрата кармІльца,правеў два антыканстытуцыйныя,антыбеларускІя,цынІчныя,амаральныя "рэферэндумы",вынІкІ якІх прызналІ толькі рускІя ІмперыялІсты І бальшэвІкІ,у чыІх Інтэрэсах яны І былІ праведзяны са шматлІкІмІ парушэннямІ на сваю карысць.

4.З мэтай захопа улады,з дапамогай збройнай сІлы былІ захоплены І разогнаны Парламент,Цэнтральная выбарчая камІсІя,МУС.

5.БальшэвІцка-камунІстычны пераварот у РэспублІцы БеларусІ адбыўся пры дапамозе вядучых дзяржаўных дзеячоў РасеІ ЧарнамырдзІна,Строева Селязнёва І маўчалІвым задавальненнІ яе ІмперыялІстычных колаў,самаго прэзыдэнта Ельцына І праваслаўнага духавенства.

6.Пад прэзыдэнта Лукашэнку А.Р.была напІсана новая канстытуцыя,а усе органы улады Ім былІ укамплектованы самІм падобранамІ людзьмІ,па прынцыпу асабІстай прэданнасцІ І бальшэвІцка-прарасейскай арыентацыІ.

7.У БеларусІ лёсаносныя пасады для беларускай нацыІ занІмаюць рускІя акупанты,каланІзатары,адстаўнІкІ-вайскоуцы,якІх называюць чорнымІ палкоўнІкамІ.

8.У РэспублІцы Беларусь адкрыта дзейнІчаюць фІлІалы расейскІх палІтычных партый І арганІзацый,нават такІя прафашыстоускІя,як "Русское национальное единство", магчыма таму,што А.Лукашэнка публІчна хвалІу А.ГІтлера.

9.У "беларускай армІІ" рускІя афІцэры падаюць каманды на рускай мове,а сама армІя носІць характар не нацыянальнай,а каланІяльнай:сам

Modern History Archives
Archiū Najnoŭšaj Historyi
Fond. 9/1464/381

А.Лукашэнка не раз адкрыта заявуляў,што беларуская армія - гэта шчыт Расеі на заходнім накерунку,на што яго ніхто не упаўнаважываў.Можна быць упэўненым,што яго сыны не будуць састаўнымі часткамі гэтага шчыта.

10.У Рэспубліцы Беларусь да гэтага часу гучыць бальшэвіцка-халуйскі гімн,ухваляючый камуністычных забойцаў мільенаў людзей - Леніна,камуністычную партыю і заваёўніцу і каланізатара нашай дзяржавы "брацкаю Русь" з якой мы беларусы быццам шукалі "к шчасцю дарог".Якая крывавымі каланіяльнымі войнамі і штыкамі навекі сплаціла саюз нерушымы рэспублік свабодных".

11.Беларусь,як ніякая другая каланізаваная краіна,засмечана рускай і камуністычнай топанімікай,помнікамі.Напрыклад,у Расеі,Маскве не знойдзеш аб'ектаў названых імёнамі беларускіх пісменнікаў,паэтаў, вучоных,змагароў за свабоду і незалежнасць,а у Беларусі рускія акупацыйныя і каланіяльныя улады масава паназывалі імёнамі сваіх паэтаў,пісменнікаў-ад А.Пушкіна да мала вядомых,заваёўнікаў,вучоных самыя разныя аб"екты,панабудовывалі ім на чужой зямле разных помнікаў,вазьміце хаця бы горад Мінск.Сваіх жа запраўдных змагароў за свабоду і незалежнасць сваей Бацькаўшчыны Беларусі,мучанікаў і ахвяр камуністычнага тэрора памяць не увекавечана,нават у Курапатах.

12.Рускія акупанты і каланізатары прымалі самы актыўны удзел у абодвух "рэферэндумах",па пытаннях якія мелі права вырашаць толькі самі беларусы,напрыклад: быць,ці не быдзь у Беларусі другой дзяржаўнай мовай рускай мове,якія у нас павінны быць дзяржаўныя сімвалы,Канстытуцыя.Разумеецца,што усе гэтыя пытанні яны вырашалі у сваіх рускіх нацыянальных інтэрэсах,за кошт нацыянальных інтэрэсаў беларусаў.

13.Рускія каланіяльныя улады і іх марыянеткі і халуі,як і іх папярэднікі,добра разумеюць,што чаго трудна дасягнуць у справе русіфікацыі гвалтам,тэрорам,турмамі,ГУЛАГ,амі тое можна дасягнуць русіфікацыяй школ,прэсы,што русіфікацыю трэба пачынаць з дзіцячых ясляў,садзікаў.Гэты свой злачынны план яны нахабна у нашым беларускім доме ператвараюць у жыцце,плюючы у твар беларускай нацыі.

14.Саветнікамі у прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнкі працуюць рускія палкоўнікі-адстаўнікі.На здраду свайму беларускаму народу яго благаслаўляюць вышэйшае праваслаўнае духоўнікі Расеі і Беларусі,завісімыя ад яе.

15.Як быццам са згоды беларускаяга народа,А.Лукашэнкай быў заключаны з РФ Саюз,канчатковай мэтай якога,як лічаць расейскія палітыкі,павінна стаць ліквідацыя беларускай незалежнай дзяржавы,русіфікацыя бела-

vytoki.net